ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# АСПЕКТ ВЫВУЧЭННЯ ГЕРБАЎ ЯК ГЕРАЛЬДЫЧНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ У НЕКРАПАЛІСТЫЦЫ

ВОЛЬГА СЯМАШКА

***Анатацыя:*** У артыкуле "Аспекты вывучэння гербаў як геральдычных элементаў у некрапалістыцы" аўтар дае агляд аспектаў выкарыстання элементаў геральдыкі ў сферы некрапалістыкі, закранае розныя дэталі вучэння гербаў на аб'ектах пахаванняў, улічвае спецыфіку такіх аб'ектаў у якасці падставаў для ініцыявання ўнясення гістарычных могілак у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

***Ключавыя словы:*** гістарычныя могілкі Беларусі, гербы, геральдыка, аб'екты пахавання, гісторыка-культурная спадчына.

## ASPECTS OF RESEARCHING COATS OF ARMS AS HERALDIC ELEMENTS IN NECROPOLIS STUDIES

***Abstract:*** In the article "Aspects of Researching Coats of Arms as Heraldic Elements in Necropolis Studies", the author gives an overview of the aspects of using the heraldry elements in necropolis environment and touches upon the details of coats of arms' teachings on the burial sites, as well as takes into account the specificity of such objects as the bases for initiation of inclusion of historic cemeteries in the State list of historic and cultural heritage of the Republic of Belarus.

***Keywords:*** Historical Cemeteries of Belarus, Coats of Arms, Heraldry, Burial Sites, Historic and Cultural Heritage.

Асновай для аховы любога аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і гістарычных могілак, з'яўляецца ягонае ўсебаковае даследаванне і дакументаванне вынікаў такога аналізу. Выяўленне асаблівых рысаў аб'екта падчас агляду дазваляе аргументаваць падставы для ініцыявання ўнясення канкрэтных могілак у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Адной з такіх рысаў, якая садзейнічае паскарэнню працэсу ініцыявання, з'яўляецца такі геральдычны элемент, як герб.

Пад "гербам" у мэтах некрапалістыкі будзем разумець графічны відарыс – пластычны кампанент афармлення аб'екта пахавання, звычайна выкананы з каменю або жалеза, які мае пэўную кампазіцыю, што складаецца з шэрага прынятых элементаў і выражаную на падставе спецыяльных правілаў.

Размяшчэнне гербаў на нерухомых прадметах, у тым ліку на надгробках, сведчыць аб іх прыналежнасці да маёмасці той ці іншай асобы, сям'і, роду. Спецыфіка герба складаецца з таго, што ён пашпартызуе і датуе пэўны прадмет, паведамляючы імя ўласніка і храналагічную дату валодання, даючы магчымасць увесці дадзены аб'ект у навуковы зварот даследаванняў і высноваў у галіне агульнай гісторыі матэрыяльнай культуры. Відавочна, што для даследчыка-некрапаліста важна валодаць шырокім дыяпазонам ведаў са шматлікіх дысцыплін, датычных гісторыі, у тым ліку і геральдыкі.

Напрыклад, герб, высечаны на надгробку, які размешчаны на гістарычных татарскіх могілках (мізары) вёскі Асмалова Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці, дазволіў без ведання мовы татарча вызначыць прыналежнасць пахаванай асобы да роду Юшынскіх.

Паказальным таксама з'яўляецца выпадак выяўлення каля вёскі Вялікі Азярэцк Сенненскага раёна Віцебскай вобласці старажытнай пліты з гербамі шляхты *"польскай"* (*Двукоссе,* 2011). Адна з гіпотэз размяшчэння такой пліты, акрамя атаесамлення з аб'ектам пахавання: *"па тагачаснай шляхецкай традыцыі знакі з выявай родавага герба ставілі пры ўездзе ў маёнтак"* (Кавалеўскі, 2011).

На Беларусі захавалася не так шмат скульптурных кампазіцый, малых архітэктурных формаў і аб'ектаў пахаванняў, на якіх размешчаны гербы беларускіх родаў ці паселішчаў. Вялікая колькасць іх была мэтанакіравана знішчана ў ХХ стагоддзі. Большасць захаваных гербаў выяўлена ў заходняй – паўночна-заходняй частках Беларусі, бліжэй да памежжа (напрыклад, Забалаць, Заказель, Масаляны, Навагрудак, Струбніца, Сянно). Стан іх адносна здавальняючы і патрабуе правядзення перыядычных рамонтных работ.

Кожны выпадак сучаснага выяўлення герба як часткі аб'екта пахавання вымагае асаблівай увагі і дэталёвага апісання знойдзенага аб'екта з улікам спецыфікі прадмета геральдыкі.

Пры даследаванні гербаў на аб'ектах пахавальных комплексаў варта кіравацца наступным планам, які складзены з улікам напрацоўкі гісторыка Алега Харужанкі (Хоруженко, 2010):

**1. Ва ўмовах палявога даследавання:**

**1.1. Вызначэнне і ўказанне аб'екта пахавання з гербам на мапе мясцовасці.**

У якасці арыенціраў для ўказання знаходжання такога пахавання варта выбіраць найбліжэйшыя аб'екты нерухомасці (у тым ліку храмы, капліцы, вартоўні), сцежкі, асаблівасці ландшафту. Варта пазбягаць у апісанні словаў "леваруч" і "праваруч". Неабходна ўлічваць, што алтарная частка ў большасці хрысціянскіх храмаў са знешняга боку мае арыентацыю на ўсход.

**1.2. Апісанне самога аб'екта пахавання, на якім знойдзены герб** (форма і стыль аб'екта, від надгробка, матэрыял, гістарычная даведка).

Акрам гэтага, фіксуецца стан аб'екта: "урос у зямлю", "паверхня пакрыта імхом/лішайнікам", "маюцца сляды ад куль/удару цяжкім прадметам", "паверхня крышыцца", "надпіс/выява герба прамаляваны фарбай канкрэтнага колеру".

**1.3. Указанне размяшчэння і памеры герба на аб'екце пахавання.**

Памер герба ўказваем у сантыметрах (першая лічба – памер па вертыкалі, другая – па гарызанталі).

Апісанне пліты з вёскі Вялікі Азярэцк: *"Памер пліты – каля 75 см у даўжыню, каля 50 см у шырыню і таўшчыню, вага – каля тоны"* (*Двукоссе,* 2011).

Прыклад з горада Навагрудка Гродзенскай вобласці: *"Герб "Слепаўрон" над эпітафіяй у верхняй частцы пліты. Памер герба па мантыі: 25*20 см"* (Сямашка, 2010).

**1.4. Фіксацыя герба (фотаздымак, малюнак, злепак, іншае).**

Рэкамендуецца зняць агульны выгляд аб'екта пахавання, асобныя відарысы герба, дэталяў герба і эпітафіі. У асобных выпадках (пашкоджанне паверхні, мох, іншае) мэтазгодна зрабіць замалёўку герба або зняць водціск выявы герба пры дапамозе паперы, алоўка, вугалю.

**1.5. Тэкставае апісанне герба.**

Апісанне гербаў з пліты з вёскі Вялікі Азярэцк: *"На яе паверхні выбітыя два радавыя гербы польскай шляхты. Адзін з іх належыць польскаму роду Даленга. На ім намаляваная срэбная падкова, звернутая шыпамі ўніз, на перадку – залаты крыж, а ўнутры падковы – ляціць уніз страла. У нашлемніку відаць ястрабінае крыло, прабітае наскрозь стралою. Такі герб прозвішча Даленга набыло ў вайну Баляслава Крываагубы з Прускім ордэнам за ўдалае паражэнне стралой аднаго з варожых военачальнікаў. Другі герб належыць, як мяркуецца, прадстаўнікам роду Косцеша. На гербе намаляваныя руніцкія знакі, вертыкальная страла*

*вастрыём уверх, яе перасякаюць дзве гарызантальныя паласы, што сімвалізуюць высокі статус роду”* (*Двукоссе,* 2011).

**1.6. Збор вуснай гісторыі аб пахаванні і выяўленым гербе.**

Вусная гісторыя павінна актыўна выкарыстоўвацца ў якасці метаду даследавання, бо часам спрашчае далейшыя архіўныя пошукі. Прынамсі вось што паведамілі жыхары вёскі Вялікі Азярэцк: *“Па словах мясцовых жыхароў, калісьці на гэтым участку поля стаяў драўляны касцёл, пры ім – могілкі. Магчыма, пад плітой былі пахаваны муж і жонка – прадстаўнікі двух родаў”* (Кавалеўскі, 2011).

**2. Ва ўмовах архіўнай працы:**

**2.1. Збор і ўказанне інфармацыі аб уладальніку герба, генеалагічная даведка аб родзе, біяграфічныя дадзеныя.**

Інфармацыя можа быць атрымана з даведкавай літаратуры. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на паходжанне і пачатковую гісторыю роду, радаслоўную легенду. Звычайна такія акалічнасці знаходзяць адлюстраванне ў гербах.

**2.2. Распрацоўка гіпотэзы аб мажлівым уласніку надгробка.**

Інфармацыя можа быць атрымана з даведкавай літаратуры. Пад увагу бяруцца ваенная і грамадская сферы дзейнасці асобы, яе ўзнагароды і чыны. Менавіта такія дэталі могуць быць адлюстраваны ў гербах.

**2.3. Складанне геральдычнага каментарыя да выяўленага герба з адпаведнай інтэрпрэтацыяй відарысаў.**

Варта выкарыстоўваць геральдычную тэрміналогію. Герб можа ўтрымліваць шчыт, шлем, карону, нашлемнік, мантыю, шчытатрымальнікі, дэвіз, арматуру, ордэны. У апісанні гербавых шчытоў, падзеленых на некалькі частак, трэба пачынаць з левага для гледача поля (падзел на два палі) або верхняга правага (пасля верхняга левага і гэтак далей) для гледача поля (падзел на чатыры палі).

**2.4. Супастаўляльны аналіз відарыса выяўленага герба з ужо вядомымі версіямі.**

Вынікі работы афармляюцца ў дзвюх частках: апісальнай і даследчай з прыкладзенымі фотаздымкамі, малюнкамі, схемамі і спісам крыніц.

***Бібліяграфія***

1. Архіў аўтара 1-АА: зафіксавана на тэрыторыі аб’екта гісторыка-культурнай спадчыны “Хрысціянскія могілкі XIX ст. г. Навагрудка” (Гродзенская вобласць, Рэспубліка Беларусь).

2. Кавалеўскі, Сяргей (2011). “Маўклівыя сведкі стагоддзяў”, *Народнае слова,* 2011, URL (доступ 01.08.2014): http://nspaper.by/2011/10/17/maklivyya-svedki-stagoddzya.html

3. “Старажытная пліта з гербамі польскай шляхты”, *“Двукоссе” – блог аб гісторыі Сенненшчыны,* URL (доступ 01.08.2014): http://senno1442.blog.tut.by/2011/10/10/starazhyitnaya-plita-z-gerbami-polskay-shlyahtyi/

4. «Татарское кладбище возле деревни Осмолово (Несвижский район)», URL (доступ 01.08.2014): http://by-mohilki.livejournal.com/21656.html

5. Хоруженко, Олег Игоревич (2010). «Гербы на памятниках материальной культуры: методические рекомендации по описанию и исследованию», *Вестник Российского государственного гуманитарного университета. Серия «Исторические науки». Историография, источниковедение, методы исторических исследований,* № 7 (50): 239–261.